УГОЛОВНОЕ ДЕЛО по факту хищения в особо крупных размерах возбуждено в Пружанах 2

ПРЫЗЫ АТРЫМАЙЦЕ! "Газета для вас" падвяла вынікі конкурсу падпісчыкаў і аматараў футбола 3

ЧЕСТЬ ИМЕЕМ! Когда закончится перебранка между союзниками? 4

ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС

ІВАЦЭВІЧЫ-БАРАНАВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН-КОБРЫН

выдаецца са студзеня 1997 года 5 — 11 ліпеня 2002 г. № 27 (342)

"ПЕСНІ МАЁЙ НЕ ПАТРЭБНЫ СВЯТЛІЦЫ..."

7 ліпеня — 120 гадоў з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы

7 ліпеня — народнае свята беларусаў — Купалле. У гэты дзень нарадзіўся Іван Дамінікавіч Луцэвіч, будучы народны паэт, які і ўзяў сабе псеўданім Купала ад гэтай святочнай назвы.

Фальварак Вязынка, дзе нарадзіўся Купала, размяшчаўся ў прыгожым кутку Беларусі, сярод маляўнічай прыроды. Яшчэ і сёння ў вёсцы Вязынка стаіць тая хата, дзе паявіўся на свет народны паэт.

Бацька Купалы быў родам з Чэрвеньшчыны, паходзіў з дробных засцянковых арандатараў.

"Усё маё юнацтва, — прызнаваўся Купала, — прайшло на чужой зямлі, у пастаяннай залежнасці і пад уціскам паноў". Гэта адмоўна паўплывала на вучобу ўсіх дзяцей сям'і Луцэвічаў. Сам Купала ў школе вучыўся мала. Так, палову адной зімы займаўся ў народнай школе ў Сенніцы, што паблізу Мінска, а потым ва ўзросце 15—16 год за адну зіму скончыў Беларуцкае народнае вучылішча.

"Прагнасць да ведаў не давала мне спакою, — успамінаў паэт, — хоць усе дарогі да навукі, як гаворыцца, былі для мяне адрэзаны. Адно, што засталося, — гэта кнігі, і я ім аддаўся ўсёй душой і сэрцам".

Самае незабыўнае ўражанне зрабілі на Купалу ў дзяцінстве беларускія народныя казкі і песні.

XXX

Асобна трэба сказаць пра музыку, якую вельмі любіў малы Ясь. Ён нават упрасіў бацьку купіць яму скрыпку. У знаёмага пастуха бацька набыў скрыпку за 50 капеек.

Як успамінае Леакадзія Раманоўская, сястра Я.Купалы, малы Ясь вельмі захапляўся музыкай. Вучыў яго іграць на скрыпцы парабак Мартын, які быў майстар на ўсе рукі.

Невядома, як бы склалася далейшае захапленне музыкай, калі б чытанне кніг не пераважыла гранне на скрыпцы.

Дарэчы, Янка хацеў вучыцца далей і прасіў бацьку пасляць яго на вучобу ў Мінск. Але бацька хацеў бачыць сына сваім памочнікам па гаспадарцы.

— Для гаспадара хопіць і тае навукі, што маеш, — казаў Луцэвіч-старэйшы.

Кніг сваіх у Луцэвічаў не было, таму Янка пазычаў іх у суседзяў па ўсёй ваколіцы. Калі хлопчыку было гадоў трынаццаць, ён пачаў выпісваць газеты і часопісы. Выдурыў у бацькі грошы на гэта.

Складаць вершы Янка пачаў у Селішчах, дзе жыла сям'я.

"Першы верш ён напісаў на мае імяніны. Было гэта ў 1902 годзе, — успамінае Леакадзія, сястра Купалы. — Вечарам ён прачытаў верш, у якім расказаў пра мой няўдалы дзень, пра ўсё, куды я хадзіла, што рабіла. Усе пачалі смяяцца з мяне. Я вельмі пакрыўдзілася на Ясю, выхапіла паперку з яго рук і кінула ў печ. Гэта было першае літаратурнае выступленне брата".

XXX

"Лёс кідае майго бацьку з месца на месца, — пісаў у сваёй аўтабіяграфіі паэт, — як і пазней мяне. У 1902 годзе бацька памёр. Маці з дзецьмі пасля смерці бацькі пераязджае на арандаваную зямлю памешчыцы Старжалковай".

У сям'і Луцэвічаў было сямёра дзяцей. Праз паўгода у адзін тыдзень смерць забрала брата Казю, сясцёр Сабіну і Гэлю. Янка, як старэйшы з дзяцей у сям'і, застаўся за гаспадара. Да 21 года ён араў, касіў, сек дровы... А па вечарах сядзеў над кнігамі. Нарэшце, праца ў дамашняй гаспадарцы Янку надакучыла, і ён пайшоў шукаць "лёгкага" хлеба. Спрэшча тры гады працаваў на броварах, а потым наёмным рабочым.

Святаслаў КАЖАДУБ.

(Заканчэнне на 6-й стар.).



Янка Купала.

Конкурс "БЕЛАРУСЬ — НАША БАЦЬКАЎШЧЫНА-МАЦІ"

Бярозаўскія сябры грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" абвяшчаюць конкурс "Беларусь — наша Бацькаўшчына-маці" (вершы, невялікія апавяданні, малюнкі і г. д.), прысвечаны 120-годдзю са дня нараджэння Янкі Купалы. Свае творы можна дасылаць на адрас: **вул. Чырвонаармейская, д. 19, кв. 9, 225210, г. Бяроза, або на адрас рэдакцыі "Газеты для вас".**

Апошні тэрмін — 30 ліпеня г. г. Пераможцаў чакаюць прызы: кнігі і аўдыёкасеты беларускіх выканаўцаў. Лепшыя творы будуць апублікаваны на старонках "Газеты для вас".

ЧАС РЭСПУБЛІКІ

Масква — сталіца злачыннасці СНД

Колькасць злачынстваў, здзейсненых грамадзянамі Беларусі ў Маскве, узрасла на 31,6 працэнта. Як паведамляе газета "Московский комсомолец", калі ў студзені — маі мінулага года беларусы здзейснілі ў расійскай сталіцы 117 злачынстваў, то за аналагічны перыяд бягучага года — 154.

У той жа час на фоне іншых краін былога СССР Беларусь выглядае лепш за іншыя. Напрыклад, колькасць злачынстваў, здзейсненых ў Маскве грамадзянамі Украіны, узрасла на 42,7 працэнта (з 1664 да 2375), Азербайджана — на 47,1 (з 546 да 803), Таджыкістана — на 59,6 (з 426 да 680), Арменіі — на 69,7 (з 185 да 314), Малдовы — на 80,2 (з 736 да 1326), Узбекістана — у 2 разы (з 190 да 380), Кіргізіі — у 2,4 раза (з 17 да 41).

Найменшы рост злачыннасці сярод выхадцаў з Грузіі — на 13,5 працэнта (з 490 да 556), Туркменістана — на 7 (з 43 да 46), Казахстана на 3,6 (з 55 да 57). Практычна не ўплываюць на крымінальную статыстыку маскоўскай міліцыі грамадзяне Балтыі. У студзені—маі 2001 года грамадзяне Эстоніі здзейснілі 3 злачынствы і столькі ж — у студзені—маі бягучага года, Літвы — адпаведна 6 і 5, Латвіі — 0 і 10.

У Баранавічах пройдзе кірмаш НДА

Баранавіцкія грамадскія арганізацыі звярнуліся да мясцовых уладаў з прапановай правесці кірмаш грамадскіх арганізацый.

У лісце, накіраваным на адрас старшыні Баранавіцкага выканкама, прадстаўнікі НДА прапануюць мясцовым органам улады выступіць ініцыятарамі правядзення кірмашу. Кірмаш прадугледжвае прэзентацыю дзейнасці арганізацый праз дэманстрацыю спецыяльнай літаратуры, а таксама актыўныя зносіны сябраў НДА з жыхарамі горада. На думку прадстаўнікоў НДА, грамадзянам будзе карысна пазнаёміцца з дзейнасцю грамадскіх арганізацый, яны змогуць знайсці для сябе нешта новае і цікавае. "У Баранавічах існуе каля 60 грамадскіх арганізацый. На жаль, на нашу думку, іх дзейнасць мала вядомая ў горадзе, і гэта неаднаразова падкрэслівалі ў сваіх выступленнях прадстаўнікі мясцовых органаў улады. У той жа час шэраг арганізацый ажыццяўляе цікавыя і карысныя праграмы. Гэтыя праграмы будуць больш эфектыўныя пры азнаямленні з імі як прадстаўнікоў органаў улады, так і насельніцтва", — гаворыцца ў лісце сябраў НДА.

Кірмашы грамадскіх арганізацый на працягу трох гадоў праводзіліся ў Мінску, Гродне і Віцебску.

Дзярждэп ЗША асуджае прысуд гродзенскім журналістам

Прэс-сакратар Дзярждэпартамента Злучаных Штатаў Рычард Баўчэр выступіў з заявай, якая тычыцца прысуду, што вынесены днямі гродзенскім журналістам Мікалаю Маркевічу і Паўлу Мажэйку. "Злучаныя Штаты далучаюцца да АБСЕ і шматлікіх арганізацый па абароне правоў чалавека, канстатуючы, што беларускі ўрад працягвае прэсінг на незалежныя сродкі масавай інфармацыі", — сказана ў заяве.

Баўчэр лічыць, што апошнія дзеянні ўлад "з'яўляюцца наступам на універсальныя прынцыпы свабоды слова і свабоды прэсы", а таксама канстатуе, што "палітычна матываваная кампанія супраць журналістаў, выконваючых свае прафесійныя абавязкі, інтэнсіфікавалася ў апошні час".

Дзярждэпартамент у які раз заклікае беларускія ўлады "вызваліць журналістаў "Пагоні", прыпыніць іх крымінальны пераслед, стварыць роўныя ўмовы для развіцця дзяржаўных і недзяржаўных СМІ, згодна з патрабаваннямі АБСЕ".

Больш як 53 % жыхароў Беларусі маюць залішнюю вагу

Незбалансаванае харчаванне прывяло да таго, што больш як 53 працэнты жыхароў Беларусі маюць залішнюю вагу. Аб гэтым паведаміў у інтэрв'ю "Інтэрфаксу" ў панядзелак прафесар кафедры гастраэнтаралогіі і нутрыцыялогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Іван Бранавец.

Паводле слоў спецыяліста, у рацыёне жыхара Беларусі ўтрыманне расліннай ежы аўчыннай вытворчасці на 50 працэнтаў ніжэй за норму.

Прафесар таксама паведаміў, што самы тлусты чалавек у рэспубліцы, які знаходзіцца пад рэгулярным кантролем урачоў, важыць 175 кг.

(Паводле паведамленняў інфармацыйных агенцтваў).

ПОДОЗРЕВАЕТСЯ ДИРЕКТОР

ПРУЖАНЫ. Прокуратурой района возбуждено уголовное дело в отношении директора Центра трудовой реабилитации инвалидов Андрея Кеды по статье 210, часть 4-я, (хищение в особо крупных размерах).

Он подозревается в краже на протяжении двух последних лет товарно-материальных ценностей на сумму 48 миллионов рублей. Мера пресечения пока не определена. Дело передано областному следственному комитету, который и решит судьбу директора. Если итоги проверки подтвердят факт хищений, то Андрею Кеда грозит лишение свободы от 8 до 15 лет с конфискацией имущества и запрещением занимать руководящие должности на пять лет.

Следствие, впрочем, может затянуться: слишком большие объемы проверки.

Кристина КРУГЛЕВИЧ.

Адзін крок да СНІДу
ад алкагалізму і наркаманіі

ІВАЦЭВІЧЫ. Кажуць, што статыстыка, — рэч упартая. Асабліва тады, калі гаворка аб такіх жахлівых з'явах сённяшняй рэчаіснасці, як алкагалізм і наркаманія сярод маладых людзей. Так, на пачатку гэтага года на ўліку Івацэвіцкай інспекцыі для непаўналетніх было 70 падлеткаў. 14 з іх здзейснілі злачынствы, а 57 чалавек знаходзяцца на ўліку ва ўрача-нарколага і пакутуюць хранічным алкагалізмам або наркаманіяй. Таму і не дзіўна, што колькасць ВІЧ-інфіцыраваных у раёне штогод павялічваецца. Да сказанага варта дадаць, што за пяць месяцаў гэтага года да крымінальнай адказнасці было прыцягнута 60 чалавек, іх узрост не перавышае 30 гадоў. Большасць злачынстваў, як правіла, былі ўчынены ў стане алкагольнага ап'янення.

Кастусь ДЗЯМЧУК.

Трагедыя на пераездзе

КОБРЫН. Жудасная трагедыя адбылася ў мінулую суботу на чыгуначным пераездзе Тэўлі Кобрынскага раёна. Калі да пераезда набліжаўся хуткі цягнік "Прага-Масква", з калоны машын, што стаяла ля яго, адддзяліўся бартавы "УАЗік" і выскачыў на чыгуначнае палатно. У выніку сутыкнення з цягнікам усе шасцёра пасажыраў загінулі. Гэта былі леснікі Зосімаўскага лясніцтва, мужчыны ва ўзросце 19—40 гадоў, якія займаліся разборкай бураломаў пасля нядаўняга стыхійнага бедства.

Ніна МАРЧУК.

Коалиция действует

ПРУЖАНЫ. Серией семинаров начала образовательную деятельность коалиция "МОЛОДЕЖНАЯ ПЕРСПЕКТИВА". Обучение подготовлено для активной молодежи третьего сектора Брестской области и проходит в г. Пружаны.

Проект рассчитан на четыре месяца и осуществляется при поддержке Программы Tacis.

Первый этап был посвящен построению команд и повышению эффективности работы в общественных инициативах.

Молодые люди получили навыки работы в группах с решением логических задач, разработкой дальнейших совместных действий на территориях своих регионов.

По окончании семинара участники пришли к пониманию того, что одним из эффективных методов влияния на общество могут стать акции, проведенные совместными усилиями локальных организаций и направленные на решение конкретных социально значимых проблем области.

Мероприятия являются частью стратегии коалиции к будущим выборам в местные Советы депутатов в 2003 году.

Юлия ТЕЛЬПУК.

"Мисс Пружаны"

ПРУЖАНЫ. 30 июня в г. Пружаны прошёл конкурс "Мисс Пружаны". Из 12 участниц в шести номенациях пять победительниц. Звание "Мисс Пружаны" завоевала Александра Запрудская... "Вице-мисс" и приз зрительских симпатий завоевала Татьяна Огороднийчук, "Мисс Элегантность" — Виктория Шерер, "Мисс Очарование" — Виктория Придуляк, "Мисс Грация" — Ольга Избицкая.

Им вручены подарки от спонсоров.

Кристина КРУГЛЕВИЧ.

Першыя ў вобласці

ІВАЦЭВІЧЫ. Першае месца ў вобласці займае Івацэвіцкае раённае спажывецкае таварыства па загатоўцы чарніц. На 2 ліпеня тут прынялі ўжо 170 тон чарніц пры плане 200 тон.

Больш за 100 магазінаў таварыства і болей за 20 нарыхтоўшчыкаў займаюцца прыёмам гэтай ягады. Вельмі актыўныя жыхары вёсак Вялікая Гаць, Магіліцы, Святая Воля, Краі, Рудня... Дарэчы, 1 ліпеня кошт чарніц крыху падвысіўся і на сённяшні момант складае 800 рублёў. Івацэвіцкі раён трывала займае першае месца ў вобласці. Так, Іванаўскі раён, які знаходзіцца на другім месцы, прыняў каля 70 тон. Частка чарніц пойдзе на прадпрыемствы перапрацоўкі, частка будзе ахаладжана. Замарожана каля васьмі тон чырвонай парэчкі, 3 тоны — чорнай. На падыходзе нарыхтоўка вішні.

Аляксандр ГОРБАЧ.

РЫНКАВАЯ ПЛОШЧА

Цэны на прадуктовых рынках нашага рэгіёну па стану на 2.07.2002 г. (у руб. за адзін кілаграм)

	Івацэвічы	Баранавічы	Бяроза	Пружаны	Драгічын	Кобрын
Свініна	3800—5800	3500—7000	3600—5800	3700—5500	3700—5500	3800—5800
Сала салёнае	4000—4500	3500—5000	3500—4500	3800—4500	3500—4500	3500—4500
Алей (1 л)	1700—2100	1500—2100	1800—2100	1700—2100	1700—2100	1700—2100
Яйкі (1 дзяс.)	1200	1200—1400	1000—1300	1200	1000—1300	1000—1200
Малако (3 л)	1000	1200—1300	1000	1000	1000	1200
Тварог	1200	1000—1200	1200	1200—1400	1200	1200
Бульба (малад.)	500—900	700—900	500—800	500—800	500—800	600—900
Масла сметанк.	4000	3500—4000	3500—4000	4000	3500—4000	3500—4000
Вішня	1000	1000—1200	1000—1200	1000—1200	1000—1200	1200
Цыбуля	1000—1500	1000—1500	1000	1000—1200	1000	1000
Агуркі	400—500	400—600	400—500	400—500	400	400—500
Морква	1400—1500	1300—1500	1300	1300	1300	1300—1500
Памідоры	1500—2200	1500—2200	1400—2000	1400—2000	1400—2000	1500—2000
Селядцы	2200—2400	2000—2300	2300—2500	2500	2300—2500	2300—2500
Парэчкі	400	400—700	400—600	400—600	400—600	400
Грэцкія арэхі	2600	2600	2000—2600	2000—2600	2000—2600	2000—2600
Яблыкі	800—2600	1200—2600	1200—2600	1200—2600	1200—2600	1200—2600
Капуста	500	500—700	500	500	500	500—700
Вінаград	4500—5500	4500—5500	4500—5500	4500—5000	4500—5000	4500—5500
Чарніцы	900—1000	1000	900—1000	900—1000	900—1000	900—1000
Перац (салод.)	3000	3000—3500	3000—3500	3000	3000	3000
Лімоны	1900—2200	2000—2200	2000—2200	2000—2200	2000—2200	2000—2200
Апельсіны	1700—1800	1500—1700	1500—1900	1600—1900	1600—2000	1600—2000
Бананы	1500—1600	1300—1600	1500—1600	1500—1600	1500—1600	1500—1600
Грэчка	600	540—600	550—600	550—600	550—600	550—600
Макар. вырабы	580—600	580—600	580—600	580—600	580—600	580—600
Рыс	700—720	700—720	700—720	700—720	700—720	700—720
Манныя крупы	650	650	650	650	650	650
Проса	480	400—480	400—480	480	400—480	480
Цукар	780	780	780	780	780	780
Мёд	6000—7000	6500—8000	6500—7000	6500—7000	6500—7000	6500—7000

ВАЛЮТА НА "ЧОРНЫМ" РЫНКУ (руб.)

	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж	купля	продаж
1 долар ЗША	1830	1900	1820	1840	1830	1900	1830	1900	1830	1900	1830	1900
1 еўра	1770	1800	1760	1780	1770	1800	1770	1800	1770	1800	1770	1800
1 рубель Расіі	56	58	56	57	56	58	56	58	56	58	56	58

ПРЫЗЫ — АТРЫМАЙЦЕ!

Падводзім вынікі конкурсу падпісчыкаў

Конкурс падпісчыкаў, які рэдакцыя "Газеты для вас" правяла са сваімі падпісчыкамі і якія, у сваю чаргу, павінны былі на працягу чатырох тыдняў даслаць або прынесці на адрас рэдакцыі квітанцыі аб падпісцы (або паведаміць іх нумар), завяршыўся.

Усяго ў конкурсе прынялі ўдзел 506 падпісчыкаў газеты (падчас правядзення двух папярэдніх аналагічных конкурсаў удзельнічала адпаведна 146 і 496 падпісчыкаў).

Розыгрыш адбыўся 28 чэрвеня ў памяшканні рэдакцыі.

Зноў-такі трэба адзначыць і падзякаваць за актыўнасць жыхароў Івацэвіцкага і Бярозаўскага раёнаў, якія прынялі вельмі актыўны ўдзел у конкурсе. Асобая падзяка белаазёрцам, многія жыхары гэтага горада ідуць па жыцці з нашай газетай і тое, што (паведамім, забягаючы наперад) менавіта чытачу з Белаазёрска пашчаслівілася атрымаць перамогу, невыпадкова.

Хто тыя, каму пашанцавала? Для каго выбар дзевяцігадовай Аксаны Кавальчук аказаўся шчаслівым? Вось яны, пераможцы конкурсу:



Ідзе розыгрыш прызоў.

1. **Т. В. Юзефовіч**, г. Белаазёрск, вул. Леніна, д. 25, кв. 44 — веласіпед;
2. **Г. І. Колас**, г. Бяроза, вул. Юбілейная, д. 27, кв. 7 — чайны сервіз;
3. **Л. А. Каранькова**, Івацэвіцкі раён, в. Быцень, вул. Талочкі, д. 8, кв. 1 — набор ручнікоў;
4. **А. В. Касавец**, г. Івацэвічы, вул. Клютко, д. 37, кв. 60 — мяшок цукру;
5. **З. С. Бялевіч**, Івацэвіцкі раён, в. Мілейкі, вул. 1 Мая, д. 101 — коўдра;
6. **Я. І. Ярмолік**, Пружанскі раён, в. Магілёўцы — прас;
7. **В. А. Рыжко**, г. Івацэвічы, вул. Шаўчэнкі, 17 — касметычны набор.

Віншуем пераможцаў. Тыя, каму не пашчаслівілася, — не засмучайцеся! Гэта не апошні наш з вамі конкурс. Галоўнае, мы разам!

Падрыхтаваў Аляксандр ГОРБАЧ.

☎ Не спрятаться, не скрыться

от шума, который издаёт пилорама

"Здравствуй, дорогая "Газета для вас". Хотим рассказать вам о нашей проблеме. Напротив нашей "четырёхэтажки" (а живём мы в г. Ивацевичи, пер Луговой, д.1) неплохо развернулся один бизнесмен, поставивший во дворе у себя пилораму.

В принципе, в этом ничего страшного нет; хуже другое: шум от этой пилорамы стоит если не круглосуточно, то, скажем так, с раннего утра до позднего вечера. Я приехала к маме из Барановичей; ребёнок целую неделю нервный, плачет. Что не удивительно: выспаться нормально здесь невозможно. Теперь, когда на улице жара, окна приходится открывать. Вместе со свежим воздухом в комнату врывается шум, от которого не спрятаться, не скрыться.

Кстати, подобная проблема стояла у моих знакомых в Барановичах. Так представьте себе: контролирующие органы нашли возможность приобрести аппарат, измеряющий высоту звука (она, кажется, измеряется в децибелах), возникшие проблемы были решены компетентно, толково, без истерик и мщений.

А что делать нам?

Ковалько Р. Т., г. Ивацевичи".

Этот вопрос мы переадресовали **главному врачу Ивацевичского РЦГиЭ Александру Алексеевичу Ковышу**. Вот какой видится проблема главному врачу:

— Ваш сигнал принят, и если, действительно, имеет место быть нарушение санитарной защитной зоны жильцов дома № 1 переулка Лугового, то меры примем незамедлительно...

От редакции: Как сообщил повторно главный врач, ситуация с производственным шумом у дома № 1 полностью исправлена. Нареканий жильцов теперь не должно быть.

Александр ГОРБАЧ. г. Ивацевичи.

☎ Выхад адзін — захоўваць правілы руху

"Я жыву ў г. Івацэвічы паблізу перасячэння вуліц імя Дзяржынскага і 60 год Кастрычніка. Рух аўтатранспарту па гэтых вуліцах стаў больш інтэнсіўным пасля таго, як праязную частку вуліцы імя Дзяржынскага (ад скрыжавання да ўстановы УЖ 15/5) адрамантавалі. Мяне хвалюе тое, што амаль кожны тыдзень на скрыжаванні сутыкаюцца машыны, праўда, пакуль што без чалавечых ахвяр. Але ж ніхто не застрахаваны ад гэтага. Праўда, церпяць ад гэтага ў большасці невінаватыя вадзіцелі.

Раней, да рамонту вуліцы, на скрыжаванні стаялі светлафоры, аднак іх знялі. Зараз стаяць знакі "Галоўная дарога" і "Перасячэнне з галоўнай дарогай". Чамусьці не ўсе вадзіцелі звяртаюць увагу на гэтыя знакі. Відаць, нешта трэба рабіць. Думаецца, прасцей тут перад галоўнай вуліцай (а гэта імя Дзяржынскага) паставіць знак "Стоп" (праезд без спынення забаронены). Ці правы я?"

Сяргей Мікалаевіч, аўтааматар.

З меркаваннямі аўтааматара рэдакцыя пазнаёміла **старшага дзяржаўтаінспектара аддзялення ДАІ Івацэвіцкага райаддзела міліцыі В. У. Мядзведзіка.**

— Аўтааматар не правы, — сказаў Віктар Уладзіміравіч. — Усе патрэбныя знакі перад скрыжаваннем вуліц імя Дзяржынскага і 60 год Кастрычніка пастаўлены. Галоўнае тут — веданне і захаванне правілаў дарожнага руху. Бяда ў тым, што асобныя вадзіцелі парушаюць гэтыя правілы. Да такіх гора-вадзіцеляў будзем прымаць самыя строгія меры, асабліва да шафёраў-ліхачоў.

Калі гаварыць пра светлафоры, то яны сталі без справы на пераскрыжаванні гэтых вуліц больш як тры гады, частка іх была сапсавана (пабіта шкло і лямпачкі). Наўрад ці хто зараз зможа вярнуць тыя светлафоры на месца.

Што ж, нельга не пагадзіцца з думкамі В. У. Мядзведзіка.

Падрыхтаваў Святаслаў КАЖАДУБ.

Віноўнік пажару... — тэлевізар

Мы прывыклі лічыць, што тэлевізар створаны толькі для таго, каб ствараць людзям добры настрой, забываючы, часам, што пры ўсім гэтым ён можа прынесці нямала засмучэнняў. Здараецца гэта тады, калі парушаюцца правілы яго эксплуатацыі. На жаль, не надалі адпаведнай увагі свайму "Гарызонту" ў доме пенсіянера з в. Дабромысль У. І. Канявегі. Пасля прагляду вячэрніх тэлеперадач сам тэлепрыёмнік выключылі, аднак вілка яго сілкавання засталася ў электраразетцы на ўсю ноч. І вось ранкам, а сёмай гадзіне, у пакоі, дзе быў тэлевізар, раптам нешта зашыпела-затрашчала і пачуўся пах гарэўшай гумы і пластмасы. Гэта гарэў тэлевізар, ад якога ў выніку пажару засталіся толькі шматлікія абгарэлыя дэталькі. Ад пажару моцна пацярпела шматлікая маёмасць у пакоі, абгарэла і сцяна драўлянага дома.

Гэтае здарэнне паказвае, што пакідаць тэлевізары, відэа-і аудыёмагнітафоны ў рэжыме "чаканне" зручна, але рызыкоўна.

Памятайце аб гэтым. І не толькі ноччу, калі лажыцеся спаць, але і выходзячы з дому нават на непрацяглы час.

Валерый МОЛАШ, ст. інспектар групы прапаганды і навучання Івацэвіцкага райаддзела па надзвычайных сітуацыях.

"Мундиаль" завершён, конкурс "На пути к Йокогама" тоже

И у нас уже есть победитель

Закончилось одно из самых значительных событий текущего года — XVII Чемпионат мира по футболу в Японии и Южной Корее. Самые разнообразные чувства вызвал он у болельщиков. Кто-то называет его Чемпионатом сюрпризов, сенсаций.

Кто-то называет Чемпионатом скандалов.

Но ни сюрпризы, ни скандалы не могли снизить живой интерес болельщиков нашего региона к "Мундиалю". В нашем конкурсе "На пути к Йокогама" приняло участие 62 читателя "Газеты для вас" — с Ивацевич и района, с Берёзовщины, Пружанщины, Барановичи, Дрогичина...

Хотя сенсации Чемпионата прилично сузили круг тех, кто претендовал на приз. Кто бы мог подумать, что медали будут делиться без участия Италии, Аргентины, Франции... Что с наградами окажутся Турция и Южная Корея. Потому лишь 13 участников конкурса угадали двух полуфиналистов — Бразилию и Германию (Н. Банасевич (г. Белоозёрск), Г. С. Мазько (г. Ивацевичи), С. Лахнюк (г. Ивацевичи), М. Банасевич (г. Белоозёрск), Н. Волчик (Пружанский район), А. Масловский (Ивацевичский район), Татьяна Остапенко (г. Берёза), Сергей Азин (г. Берёза), Василий Басик(Берёзовский район), Олег Харитонович (г. Ивацевичи), Елена Особик (г. Ивацевичи), Виктор Литвинович (г. Ивацевичи-4), А. В. Горбач (г. Ивацевичи). Только два участника правильно указали счёт матча Аргентина—Швеция (1:1) — М. Рыбак (г. Ивацевичи), Г. С. Мазько (г. Ивацевичи). Точный счёт игры Россия—Бельгия не предсказал никто.

Кто будет играть за третье место тоже не угадал никто — что не удивительно. И только четыре участника из 13 вышеупомянутых Бразилию и Германию поставили в финал.

Эта четвёрка (Елена Особик, г. Ивацевичи, ул. Черткова, д. 29, кв. 17 (её прогноз — 1:0 в пользу Бразилии); Олег Харитонович, г. Ивацевичи, Дзержинского, 38а (2:0 — Бразилия); Виктор Литвинович, Ивацевичи - 4, д. 8 кв. 38 (2:1 — Бразилия); Сергей Лахнюк, Советская, д. 11 кв. 32 (1:0 — Бразилия)) и явилась основными претендентами на победу. Первое место, набрав 150 баллов, занял **ОЛЕГ ХАРИТОНОВИЧ**. У Елены Особик — 140 баллов, у Виктора Литвиновича и Сергея Лохнюка — по 130 баллов, у М. Рыбака и Г. Мазько — 100, у Н. Банасевича и Н. Волчика — по 80 баллов...

Поздравляем победителя! Благодарим спонсоров! Приглашаем победителя к нам в редакцию за призом. Кстати, фото победителя и интервью с ним вы сможете увидеть в ближайшем номере "Газеты для вас".

Александр ГОРБАЧ. г. Ивацевичи.

ЧЕСТЬ ИМЕЕМ?

Когда закончится перебранка между союзниками?

14 июня сего года, всего каких-то три недели назад, президент России Владимир Путин весьма прохладно оценил уровень белорусско-российских отношений, а его желание разделить условные мухи и котлеты стало своеобразной отмашкой для политиков всех уровней с двух сторон.

И, так сказать, чубы затрещали.

Но если с белорусской стороны голоса звучат угодливо, отчётливо обозначена попытка попробовать замять этот спор, то российские политологи "отвязались" окончательно, по полной программе "отгрузив" белорусской стороне "чудо-комплиментов" вагон и маленькую тележку.



Хотя, если быть до конца объективным, большая часть российских политологов всегда пренебрежительно относилась к действующему президенту РБ. Владимир Познер, Борис Немцов, Отто Лацис, Максим Соколов с товарищи — все они, правда, эпизодически, весьма нелестно высказывались в адрес руководителя Беларуси. Теперь "плотину" прорвало, пошли "пощёчины" и "затрещины".

В принципе, спорные вопросы всегда вызывали колючие и где-то нелицеприятные разговоры. Особенно внутри государства. Так, Борис Немцов и Владимир Жириновский в своё время дошли до того, что каждый, по очереди, плеснул стакан воды в лицо собеседника, весьма досталось в своё время вахучерному "интегратору" Анатолию Чубайсу...

Но ни одному из них так не досталось, как теперь достаётся белорусскому президенту. "Главный белорусский колхозник", "белорусское беззаконие", "авторитарный режим" — вот только маленькая толика из того моря "эпитетов", которые вылились на Лукашенко с телеэкранов и страниц российских газет.

Но президент страны — это не рядовой чиновник внутреннего госаппарата. Это символ страны (отстранимся от личных симпатий и антипатий). Как флаг или гимн. Символ, к которому вроде бы надо иметь более терпимое отношение. Российские политологи — обратите внимание! — никогда не позволят себе высказаться грубо в адрес Леонида Кучмы, Александра Квасьневского, Альгирдаса Бразаускаса... Тут чувство такта и деликатность всегда присутствуют. А вот к президенту страны, которая не отворачивается от России, а прямо льнёт к ней, отношение более чем пренебрежительное.

Это отношение лишний раз подчёркивает пропасть между российской и белорусской ментальностью, сколько бы не говорили о том, что мы — народы братские.

То, что в Беларуси икона, в России — хохма, так сказать. Российские КэВээНщики, юмористы (вроде Максима Галкина) с огромным удовольствием шутят над образом белорусского президента, над символом страны, повторимся.

Почему всё так? Почему никто не видит, не возмутится, не поднимет эту тему? Почему даже к своим губернаторам российские СМИ относятся более терпимо, чем к президенту суверенного государства (опять-таки, отстранимся от личных симпатий и антипатий). С другой стороны, долго ли белорусское руководство будет делать хорошую мину при плохой игре, прикрываясь судьбоносностью встреч, коим несть числа?

Может, хватит смешить всю Россию?

Александр МИХАЛЕНКО.
г. Ивацевичи.

Российские политики просят Путина найти исчезнувших оппонентов Лукашенко

В понедельник руководители четырех крупнейших фракций Госдумы России на встрече с президентом России Владимиром Путиным передали ему обращение с просьбой привлечь российские спецслужбы к поиску белорусских исчезнувших политиков Юрия Захаренко и Виктора Гончара, журналиста Дмитрия Завадского и бизнесмена Анатолия Красовского.

Обращение руководителей крупнейших российских фракций Госдумы к президенту России стало итогом переговоров, которые на прошлой неделе российские политики провели с родственниками исчезнувших и репрессированных белорусов. Светлана и Ольга Завадская, Зинаида Гончар, Юлия Чигирь и Ирина Красовская направились в Москву, где напрямую высказали свои просьбы российским политикам.

Хартия-97.

Правительство Германии осуждает наступление на свободу СМИ в Беларуси

Уполномоченный по правам человека и гуманитарной помощи правительства Германии Герд Попэ высказал обеспокоенность положением с ситуацией с правами человека в Беларуси.

Герд Попэ заявил, что суд над журналистами газеты "Пагоня" Николаем Маркевичем и Павлом Можейко является "неприемлемым наступлением на свободу СМИ в Беларуси. Этот приговор находится в возмутительной противоречивости с обязательствами, которые Беларусь взяла на себя как член ОБСЕ. Уже тот факт, что белорусское уголовное право допустило такое осуждение, несовместим с элементарными принципами свободы и СМИ".

По мнению представителя правительства Германии, критиков президента Лукашенко хотят заставить замолчать. По словам Попэ, об этом же свидетельствует и ситуация вокруг редактора газеты "Рабочы" Виктора Ивашкевича.

Хартия-97.

ФРАНЦ ВИТКО:

"Нам необходимо стряхнуть старую кожу"

26 июня состоялась пресс-конференция Председателя Федерации профсоюзов Белорусской Франца Витко, посвященная реформам в профсоюзном движении Беларуси. Ф. Витко сделал следующее Заявление:

"Долгое время в нашем государстве профессиональные союзы были придатком власти. К этому привыкли. В последние годы профсоюзы стремились стать тем, чем и должны быть — независимой общественной организацией, защищающей права и интересы трудящихся. Эта возможность по разным причинам была использована лишь частично.

Что есть сегодня наше профсоюзное движение? Настоящая общественная организация — независимая и дееспособная? Укромное место для тех, кто не может, да и не хочет работать? Плацдарм для реализации собственных амбиций? Люди хотят услышать ответы на эти вопросы.

К сожалению, отдельные профсоюзы и их лидеры забыли об истинных целях профсоюзного движения. Но на ошибках, в том числе и собственных, нужно учиться. Сегодня мы подошли к черте, перед которой нужно сделать выбор. Мы должны понять, кто мы и выбрать, с кем мы.

Убежден, что у нас немало настоящих активистов, для которых профсоюзное движение — не пустой звук. Именно на местах, в профкомах, цехкомах предстоит определить, какими станут профсоюзы — послушными исполнителями указаний государственных и хозяйственных органов или подлинными выразителями интересов трудящихся. В течение ближайшего времени мы все вместе должны обсудить пути обновления нашей организации, чтобы на IV внеочередном съезде ФПБ принять необходимые решения.

А тем, кто уже "похоронил" Федерацию профсоюзов, скажу — ждите, пока вас востребует власть, идите своей дорогой. Мы никого не будем держать насильно. Каждый делает свой выбор и несет за него полную ответственность. Пусть членов профсоюза станет меньше, но это будут реальные сторонники профессиональных союзов, объединенные общими целями и задачами, готовые к активным солидарным действиям. Ведь фундаментом подлинной профсоюзной организации является готовность ее членов отстаивать свои права.

Настал момент истины, момент обновления профессиональных союзов. И это обновление должно идти по всем направлениям. Профсоюзы — это, прежде всего, трудовые коллективы, рядовые труженики города и села, рабочие, служащие и интеллигенция. Федерация, отраслевые и территориальные комитеты и советы должны выражать их мнение и действовать в соответствии с их волеизъявлением.

Мы обязаны реформировать профсоюзное движение Беларуси. Но так, как это нужно трудящимся, а не так, как хотелось бы власти. Уверен, профсоюзы Беларуси станут на деле независимыми, сильными и уважаемыми в обществе".

XXX


Вся работа по подготовке Съезда ФПБ сосредоточена на определении функций и задач, структуры, форм и методов работы профсоюзов, входящих в Федерацию. Из числа представителей отраслевых профсоюзов создана Рабочая группа по подготовке к внеочередному IV съезду ФПБ. Она, в свою очередь, разбита на 4 подгруппы. Первая занимается концепцией изменений в устав, вторая — концепцией развития профсоюзного движения и платформы ФПБ, третья — подготовкой документов Съезда, четвертая — подготовкой отчетного доклада. Группа по уставу уже провела первое рабочее заседание. Важно то, что Федерация смогла, наконец, наладить должную обратную связь со своими первичными организациями в трудовых коллективах. И они активно выдвигают свои пожелания, концепции и предложения. Ведется масштабная работа, обрабатывается огромное количество инициатив, поступивших от первичек и от нижестоящих структур Федерации. Все должно быть тщательным образом рассмотрено и обобщено.

"Мы считаем, что Федерация, как Национальный профсоюзный центр, должна состоять только из республиканских отраслевых профсоюзов. Сегодняшний устав позволяет первичным организациям отдельных предприятий входить в ФПБ. Но если мы считаем, что отраслевой принцип построения Федерации должен быть основополагающим, это должно быть четко прописано в уставе" — отметил Франц Витко.

Поставлена задача упразднить лишние, дублирующие друг друга звенья в профсоюзной структуре. Комиссия уже подготовила предложения к очередному заседанию Президиума, которое состоится в пятницу. Предполагается соблюсти федеративный принцип образования национального профцентра, но "отраслевые республиканские профсоюзы и Федерация должны быть подконтрольны сверху донизу".

Реформы в профсоюзном движении назрели давно. Очевидно, что организации необходимо избавляться от балласта. Ресурс любой общественной организации — это люди, живые люди, принимающие активное участие в работе, а не просто существующие на бумаге. "Нам необходимо стряхнуть старую кожу", — отметил, выступая перед журналистами, Председатель ФПБ. Активных членов профсоюза нужно привлекать к работе, и, начиная реформы, ориентироваться, в первую очередь, на них. Если это будет доведено до конца, профсоюзное движение Беларуси получит приток новой крови, существенно усилится и сможет безукоризненно выполнять свои программные задачи.

Пресс-служба ФПБ.



ВОЛЬНЫ РЭГІЁН





Земовит Блуденский в числе защитников Новогрудского замка.



Крестоносцы полны решимости взять штурмом неприступные стены.



Битва за замок в полном разгаре, захватчики отступают от его стен.

В их крови не хватает ЖЕЛЕЗА

Без сомнений, событием №1 на минувших выходных был финал чемпионата мира по футболу. Казалось бы, ничто не могло отвлечь людей от телевизора. Тем не менее, 30-40 тысяч человек, съехавшиеся в эти дни в г. Новогрудок из разных уголков Беларуси, всё-таки отдали предпочтение происходившему там Второму Средневековому фестивалю "Навагрудскі замак". Ведь это — одно из крупнейших мероприятий подобного рода в Восточной Европе, в котором приняли участие около 800 членов рыцарских и военно-исторических клубов Беларуси, России, Украины, Польши, стран Прибалтики.

1314

Итак, 1314 год. Время правления Гедимина. Крестоносцы во главе с магистром Тевтонского ордена Генрихом фон Плоцке осаждают Новогрудский замок, но потом, под натиском его защитников, с позором отступают. Эта инсценировка знаменитой битвы и становится кульминацией всего праздника.

Зрители расположились на склонах огромного замкового рва, события же разворачиваются на его дне — всё видно как на ладони. Что-то в этом напоминает древние гладиаторские бои в амфитеатрах.

События

Кроме инсценировки битвы программа фестиваля была весьма и весьма насыщенная: представление клубов-участников, "Турнир Короля Миндовга", турнир стрелков из лука и метателей сулицы, топора, бревна, воинские игры и ночной бугурт, непрекращающиеся концерты на главной площади города, театральная постановка "Коронация Миндовга", ярмарка сувениров, выставка гербов, салют и т.д. — всего не перечесть.

В лагере участников

Рыцарский Стан, обнесённый по периметру деревянной изгородью, разместился в парке у Замковой Горы. Шатры, развевающиеся хоругви и знамёна, костры, бряцанье оружия, звуки горна, вперемешку белорусская, польская, русская речь, смех — всё как несколько столетий тому назад.

"Ратный круг"

Участвовать в этой турнирной "забаве" отважились 18 рыцарей. Они и образовали "первый круг". Чтобы выйти во второй круг — надо один за другим победить троих противников. В финал турнира — "третий круг" — проложили себе дорогу лишь трое сильнейших.

Внимание десятков тысяч приковано к пятачку земли и нескольким фигуркам на нём. Людское море на замковых валах волнуется и скандирует: "Бе-ла-русь! Бе-ла-русь!" Беларусь для них всех в этот миг — Роланд Мак Гир, он же Фридом из минского клуба "Дикая Охота". Ведь финал — это не просто состязание трёх рыцарей. Они — представители Беларуси, России и Украины.

В ожесточённом бою победу с незначительным перевесом одерживает россиянин, у Мак Гира — второе место. Пошатываясь от усталости, мокрые от дождя и пота, рыцари покидают ристалище.

Игра

Что заставляет людей ковать доспехи, оружие, шить старинную одежду, ездить на турниры? Тратить своё время, деньги? Что оно вообще такое, наша жизнь? Игра! Только для кого-то это игра не в менеджеров, дилеров и депутатов, а в благородных рыцарей. И Средневековый мир для них, пусть во многом идеализированный, намного привлекательнее современного. А средство наказать злодея — не милиция или суд, а верный меч.

"Блудэнская харугва"

Единственный пока в наших окрестностях клуб. Место постоянной дислокации — д. Первомайская Берёзовского района. Основан в 2000 г. Участвовал в 1-м Национальном рыцарском турнире "Меч Гедимина" в г. Мядель в 2001 г. На хоругви и щитах — три белых клыка на зелёном поле — рисунок герба короля Стефана Батория, некогда владевшего деревней Блудень.

По оценкам главного турнирного судьи — руководителя московского клуба "Братина" Андрея Зимина и организатора фестиваля Игоря Михно, "Блудэнская харугва" за прошедший год достигла довольно-таки неплохого уровня. Об этом свидетельствуют и приглашения от других рыцарских клубов, в том числе иностранных.

Амуниция

Полное вооружение рыцаря весит около 30 кг. Боевая кольчуга, например, — порядка 18 кг, меч — от 1,2 кг и выше. Всё изготавливается самостоятельно. Рыцари, кто посостоятельнее, могут купить готовое снаряжение. Хороший меч стоит до 200 долларов США, кольчуга — 80-120. Но железом дело не ограничивается. Нужна ещё одежда под доспехи, обувь — всё в духе выбранной эпохи, желательно пошитое вручную и из натуральных, без добавления синтетики, тканей.

Прекрасные дамы

Какой же рыцарский турнир без них? В таком случае вообще теряется всякий смысл этих самых турниров.

Дамы перед боем повязывают своим рыцарям поверх доспехов платочки, мужественно шагают за ними по грязи в туфельках, приподнимая подолы длинных платьев, вытирают затем разгорячённые и измождённые лица избранников.

Осадок

"Бей москалей!" — слышалось из толпы зрителей в самые острые минуты поединков. Нехороший осадок от этого остался в душе у многих участников фестиваля. Рыцари из Москвы и Тулы оказались неплохими ребятами, к тому же они были в числе сильнейших бойцов на турнирах. Доморощенным "патриотам" с рабской психологией было, видимо, невдомёк, что к гостям так не относятся.

Немного геометрии

Из-под бархатного платья прекрасной паненки проглядывают никак не средневековые кроссовки. Мужественный рыцарь в перерыве между турнирами, подняв забрало, пьёт из полуторалитровой пластиковой бутылки минеральную воду "Фрост". А его товарищ в это время, держа в одной руке меч, мирно разговаривает по сотовому телефону. Параллельные миры пересекаются.

Рост

В бывший Союз рыцарские клубы пришли с закатом Перестройки. В странах Европы этому движению уже лет 30, если не больше. Тем не менее наши рыцари из года в год становятся всё искуснее, а доспехи и оружие — всё более совершеннее. Некоторые белорусские клубы и отдельные рыцари уже ездят на турниры в Польшу, Чехию.

Дождь

Тяжёлые тучи в небе над Новогрудком то и дело проливаются на землю дождём. Но это никак не сказывается на участниках фестиваля. Турнирные бои не прекращаются ни на минуту, лишь финал "Ратного круга" приостановлен, когда небеса вконец разверзлись и хлынул самый настоящий ливень. Рыцари стойко вынесли и это испытание. Постепенно на кольчугах и мечах начал проступать буроватый налёт ржавчины.

Пивной турнир

В левой руке вместо щита — кружка пива. Побеждает тот, кто меньше всего расплескает этого напитка.

Всё взаправду

Театральности здесь никакой. Удары наносятся в полную силу. Уберечь рыцаря может лишь крепость его доспехов, а принести победу — булатный меч и искусство владения им. Рыцарские турниры, а особенно бугурты (групповые бои) — занятие довольно опасное. Ссадины, шишки и синяки на них — обычное явление. Случаются и переломы, сотрясения мозга. В целях безопасности снаряжение каждого участника проходит тщательный контроль специальной комиссией, а сам рыцарь должен быть обязательно застрахован. В поединках иногда даже не выдерживает сталь — ломаются мечи, а на доспехах и щитах остаются весьма убедительные вмятины.

Полосу подготовил Николай СИНКЕВИЧ, фото автора.

“ПЕСНІ МАЁЙ НЕ ПАТРЭБНЫ СВЯТЛІЦЫ...”

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Як успамінае сястра паэта Леакадзія Дамінікаўна, Янка Купала пісаў усюды — на полі, на возе, у дарозе... Спярша гэта былі няўмелыя спробы, штосьці падобнае на прачытанае ім, якое засталося ў памяці.

“Я сам не веры ў, — пазней прызнаваўся паэт, — што звычайныя людзі могуць пісаць вершы. Тэорыі ніякай тады я не ведаў і ўяўлення пра яе не меў”. Тым не менш, 25 мая (ст. ст.) 1905 года ў мінскай газеце “Северо-западный край” быў надрукаваны першы верш Янкі Купалы “Мужык”.

Што я мужык,
усе тут знаюць,
І як ёсць гэты свет
вялік,
З мяне смяюцца,
пагарджаюць, —
Бо я мужык,
дурны мужык...

Гэта і з’явілася афіцыйным пачаткам літаратурнай творчасці Янкі Купалы.

XXX

Пасля першай публікацыі ў друку Янка Купала атрымаў, так сказаць, першае паэтычнае хрышчэнне і працягваў пісаць. Так, у 1906 годзе ім напісаны вершы “Што ты спіш?”, “Там”, “Водклік з 29 кастрычніка 1905 г. у Мінску”, “Доля ўдавы”, “Каршун”, паэмы “Нікому” і “Зімою”.

У 1908 годзе выдавецкая суполка “Загляне сонца і ў наша ваконца!” у Пецярбургу выдае першую кнігу вершаў Янкі Купалы “Жалейка”.

“Першы зборнік маіх вершаў быў двойчы канфіскаваны, — пісаў Купала, — першы раз па распараджэнні Пецярбургскага камітэта па справах друку, а другі раз — па прапанове віленскай адміністрацыі”.

З нагоды выхаду ў свет паэтычнага зборніка “Жалейка” газета “Минский курьер” у тым жа годзе пісала: “На вуліцы “Маладой Беларусі” вялікае свята! Сонца жывой, сапраўднай паэзіі заглянула ў ваконца цёмнай, беднай, але вялікай хаты беларускага народа... Няхай ён (Купала — **С. К.**) будзе для беларусаў тым, чым быў Шаўчэнка для Украіны!..”

І сапраўды, Янка Купала быў шчырым другам працоўных і абаронцам іх інтарэсаў.

Я мужык-беларус,—
Пан сахі і касы;
Цёмен сам, белы вус,
Пядзі дзве валасы...
Эй, каб цёмен не быў,
Чытаць кніжкі ўмеў, —
Я б і долю здабыў,
Я б і песенькі пеў!
(“Я мужык-беларус...”).

XXX

Вялікі рускі пісьменнік Максім Горкі, пазнаёміўшыся з творамі Я. Купалы, верш “А хто там ідзе” назваў “красамоўнай і суровай песняй”, беларускім гімнам. І не выпадкова, бо на гэты верш Л. М. Рагоўскім была напісана музыка.

Дарэчы, трохі пазней Горкі ў пісьме да вядомага ўкраінскага пісьменніка М. Кацюблінскага паведамляў: “У Беларусі ёсць два паэты: “Якуб Колас і Янка Купала — вельмі цікавыя хлопцы. Проста пішуць так, ласкава, сумна, шчыра. Нашым бы трошкі гэтых якасцей. О божа! Вось бы добра было!”

А “Наша ніва” ў жніўні 1908 года пісала: “Песні Купалы — гэта люстра, у каторым свеціцца душа беларуса... непадробны голас, што ідзе з самай глыбі народнай душы...”

Восенню 1908 года Янка Купала пакідае працу на бровары і едзе ў Вільню. Там ён працуе ў прыватнай бібліятэцы Б. Л. Даніловіча “Знание” і ў рэдакцыі газеты “Наша ніва”.

Паэт імкнуўся павысіць свае веды, але ў Вільні не было адпаведных умоў. Таму ў канцы 1909 года Купала пераязджае ў Пецярбург і паступае на агульнаадукацыйныя курсы А. С. Чарняўскага. “Яны, — сцвярджаў паэт, — так сказаць, сістэматызавалі мае хаатычныя веды, якія я набываў з прачытаных кніг. Тут я больш пазнаёміўся з тэорыяй і гісторыяй літаратуры”.

XXX

Гады навучання ў Пецярбургу мелі вялікае значэнне ў павышэнні паэтычнага майстэрства Янкі Купалы. У горадзе над Нявой напісана некалькі паэм, выдадзены зборнікі вершаў “Гусляр” і “Шляхам жыцця”.

Іменна ў Пецярбургу паэт спрабуе свае сілы ў жанры драматургіі. Значны ўплыў на яго аказала знаёмства з арганізатарам першай прафесійнай беларускай трупы Ігнатам Буйніцкім.

Знаходзячыся на канікулах у Акопах (хутар на Лагойшчыне, дзе жыла маці Бянігда Іванаўна), Янка Купала летам 1912 года напісаў камедыю “Паўлінка”. Спектакль быў пастаўлены гуртком пры Пецярбургскім універсітэце 9 лютага 1913 года. Галоўную ролю Паўлінкі выконвала Паўліна Мядзёлка. Пасля пастаноўкі студэнты падарылі Янку Купалу залаты гадзіннік з надпісам: “Бацьку “Паўлінкі” ад беларускіх студэнтаў”.

Упершыню ж п’еса была паказана ў Вільні (27 студзеня 1913 года) у пастаноўцы беларускага музычна-драматычнага гуртка (рабочых клуб “Сокал”).

Увогуле 1913 год быў вельмі плённым для паэта. 24 чэрвеня ён закончыў паэму “Бандароўна”, 2 ліпеня — “Магілу льва”, 24 ліпеня — паэму “Яна і я”, 31 ліпеня — сцэнічны жарт у адным акце “Прымакі”, 4 верасня — драму “Раскіданае гняздо”.



Хата, дзе нарадзіўся паэт.



Я. Купала сярод моладзі.



Помнік Я. Купалу ў ЗША.

XXX

Закончыўшы курсы А. С. Чарняева, Янка Купала ў 1913 годзе вяртаецца ў Вільню і пачынае працаваць у “Нашай ніве”. Спачатку — літработнікам, а затым — адказным рэдактарам. Паэт імкнуўся надаць газеце рэвалюцыйна-дэмакратычны кірунак, але гэта не мела належнага поспеху. Кожнае слова праходзіла строгую цэнзуру. Так, у перыяд першай сусветнай вайны “Наша ніва” часта выходзіла з белымі плямамі — слядамі царскай цэнзуры. А другі нумар газеты ад 16 студзеня 1915 года за артыкул “Думкі”, у якім Купала выкрываў драпежніцкі характар вайны, быў канфіскаваны. Супраць рэдактара была ўзбуджана судовая справа.

Гэтыя падзеі і набліжэнне фронту прымусілі Янку Купалу пакінуць Вільню. У верасні 1915 года паэт пераязджае ў Маскву і паступае на ўніверсітэт імя А. Л. Шаняўскага, дзе правучыўся каля пяці месяцаў. На пачатку 1916 года Купалу прызываюць у армію і залічваюць старшым рабочым будаўніча-дарожнага атрада па рамонту шасейных дарог. Служыў у Мінску, Полацку і Смаленску. Іменна ў Смаленску ён атрымаў вестку аб Кастрычніцкай рэвалюцыі.

XXX

Бальшавіцкае кіраўніцтва ў Смаленску не хацела прызнаць суверэннай Беларусі. У снежні 1917 года бальшавікі разагналі Усебеларускі кангрэс — з’езд нацыянальных партый, на якім вырашалася пытанне аб самастойнай Беларусі. Арганізатары з’езду былі арыштаваны. Тым не менш 25 сакавіка 1918 года было абвешчана аб утварэнні БНР — Беларускай Народнай Рэспублікі.

Падзеі развіваліся імкліва. На змену бальшавіцкаму войску прыйшлі акупанты з Германіі, а затым іх замянілі польскія інтэрвенты.

Нарэшце, у канцы 1918 года бальшавіцкае кіраўніцтва з Масквы дазволіла беларускім нацыянал-камуністам стварыць свой беларускі ўрад на чале з З. Жылуновічам. Аднак урад Жылуновіча праіснаваў некалькі тыдняў.

Пасля выгнання інтэрвентаў быў створаны новы ўрад на чале з А. Чарвяковым. Узнікла рэальная магчымасць вызваліцца ад каланіяльнай залежнасці. Аднак у хуткім часе наступіла пара сталінскіх рэпрэсій.

Усе гэтыя падзеі знайшлі сваё адлюстраванне ў творах Янкі Купалы. Паэт вельмі востра перажываў драму нацыянальнага адраджэння. У тыя гады, гады сталінізму, нельга было сказаць праўду ў літаратуры. Сімвалам таго часу сталі Курапаты — фабрыка смерці пад Мінскам.

XXX

У сваім артыкуле “Незалежнасць” (1919 г.) Я. Купала пісаў: “Беларускі народ самабытны — гэта прызнаюць ужо нават і нашы праціўнікі... Наша незалежнасць соллю ў вочы для незалежнасці нашых суседак — Польшчы і Расіі, бо адна і другая хацелі б нашу незалежнасць утапіць у лыжцы вады сваёй незалежнасці... А Беларусь, як і кожная іншая дзяржава, мае права і даб’ецца раней ці пазней гэтага права стаць роўнай вольнай дзяржавай паміж сваімі суседзямі...”

Дарэчы, на старонках газет, часопісаў тых гадоў друкаваліся творы, у якіх славілі Сталіна і яго сатрапаў. Шмат хвалебных вершаў напісаў і Купала. Аднак не яны вызначаюць характар яго творчасці. Жыццё паэта толькі знешне было шчаслівым. Глыбока ў сэрцы была схавана яго трагедыя. Нездарма ў 1930 годзе паэт зрабіў замах на сваё жыццё, але Купалу ўдалося выратаваць. А пазней рэпрэсіям падвергліся яго блізкія.

У чэрвені 1942 года Янка Купала прыехаў у Маскву для падрыхтоўкі юбілейнага вечара, прысвечанага свайму 60-годдзю. Але вечар не адбыўся. 28 чэрвеня 1942 года паэт загінуў у маскоўскай гасцініцы пры нявысветленых дагэтуль акалічнасцях. Урна з прахам Янкі Купалы перавезена ў Мінск.

XXX

Мінаюць гады, і чым далей яны аддаляюць нас ад вялікага песняра, тым велічней і даражэй становіцца яго вобраз. І сёння Янка Купала крочыць побач з намі, такі ж малады і натхнёны, такі ж мудры дарадца і нястомны настаўнік.

Стала песня славаю
народа.
Што ёй бронза,
мармур ды музей!
У душы прапісаны
зусёды
Ты жывеш, паэт,
сярод людзей.

Нельга не пагадзіцца з паэтам А. Вялюгіным, які прысвяціў Купалу гэтыя шчырыя паэтычныя радкі.

Святаслаў КАЖАДУБ.
г. Івацэвічы.

Малавядомыя вершы

Як спытаюцца нас

Прыйдуць людзі з Усходу,
Прыйдуць з Захаду людзі
І спытаюцца нас:
“Скуль, якога вы роду?
Дзе зямля ваша будзе,
Дзе айчызна ў вас?”
Мы ля плоту, пад плотам
Паглядзім, пашукаем,
Які даць тут адказ,
І адкажам: “Э, што там...
Мусіць, бабскім звычаем
Збегла ўпрочкі ад нас”.

1911 г.

Хай жа вам так не здаецца...

Хай жа вам так не здаецца
Што бяда ўжо і зацісне.
Знайце, ліха перапрэцца
І маланкай доля блісне.
Праўда, поўны сумаў весці
Буйны вецер нам прынасіць,
Што як з гора, як з балесці,
Каля нашых хат галосіць —
І галосіць, і заводзе,
Плача, як па дзетках маці,
Аж бы крыкнуў:
годзе, годзе!
Годзе сэрца жалем рваці!
Але ўсё ж хай не здаецца,
Што бяда ўжо і зацісне, —
Наша ліха перапрэцца,
І маланкай доля блісне.

1906 г.

А ты, браце, спі!

Вясна. Сонца узыходзе,
Свеце на зямлі;
Дух збудзіўся у народзе,—
Усталі, пайшлі.
Ёсць і працы, ёсць і поту,—
Спаць няма калі!
Дружна валяць на работу,—
А ты, браце, спі!..
Спі, на слёзы і на гора
Рукою махай;
Хоць зрабіў бы ты з ім мора,
А кажы: няхай!
Няхай тыя уставаюць
Рана да зары,
Што свабодачку кахаюць!—
А ты, браце, спі!..
Недастатак госця ў хаце,
З крыўдай дух замёр;
Дзеці, жонка шлюць
пракляцце...
Ты ж, як той тапор!
Дрэмле сошка, і адлогам
Шнур ляжыць даўгі,
Рржа касу есць
пад парогам...
А ты, браце, спі!
Спі, а можа хто заблудзе
У твой бедны край
І цябе з душой
разбудзе,—
Крыкне: “Уставай!”
Ты на гоман той народны
Паходню бяры
І другіх будзі з паходняй!..
А мо лепей... спі?!

1905—1907 гг.



Надзеі і трывогі Яраслава Пархуты

(Працяг. Пачатак у № 23, 24, 25, 26).

IV. КРЫНІЦА ВЕЧНАЙ ЛЮБВІ

●

Кніга эцюдаў Яраслава Пархуты "Жаваранак над полем" пабачыла свет у 1985 годзе. З яе і пачынаецца серыя кніг-падарожжаў нашага земляка.

Яшчэ народны пісьменнік Беларусі Якуб Колас пісаў: "Прырода — найцікавейшая кніга, якая разгорнута перад вачамі кожнага з нас. Чытаць гэту кнігу, умець адгадаць яе мнагагучныя напісы — хіба ж гэта не ёсць шчасце?"

Дарэчы, у аснову першай кнігі падарожжаў і пакладзена апісанне мясцін, дзе нарадзіліся ці жылі славутыя людзі зямлі нашай, а іменна: першадрукар Францішак Скарына, паэты Паўлюк Багрым, Адам Міцкевіч, Францішак Багушэвіч, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Паўлюк Трус, мужныя барацьбіты за свабоду і незалежнасць роднага краю — Тадэвуш Касцюшка, Кастусь Каліноўскі, дзед Талаш, Сяргей Грыцавец, Леў Даватар, Васіль Корж, вядомыя вучоныя Іван Чэрскі, Яўхім Карскі, Ота Шміт, пісьменнікі Эліза Ажэшка і Іван Мележ, мастак Бялыніцкі — Біруля...

Словам, пра сівую даўніну і сённяшні дзень роднай зямлі апавядае аўтар, пра непаўторную прыгажосць нашай прыроды, пра праблемы экалогіі, а таксама пра паўсядзённыя клопаты людзей.

●

І ўсе наступныя кнігі пісьменніка — "Ёсць крыніца ў родным краі", "Зямля бацькоў нашых", "Жальба жытняга коласа" — гэта працяг размовы нашага земляка пра вандроўкі па роднай зямлі, яго сустрэчы з людзьмі, наведванне славутых мясцін.

Пісьменніка заўсёды хвалявалі пытанні: хто мы, адкуль нашы карані, дзе вытокі духоўнай і матэрыяльнай культуры нашага народа?

Напрыклад, у кнізе "Зямля бацькоў нашых" апавядаецца пра самую высокую і самую нізкую геаграфічныя кропкі рэспублікі, самую паўночную, усходнюю, паўднёвую і заходнюю вёскі.

Чытач пабывае ў Белавежы, на месцы здабычы беларускай нафты, калійнай солі, граніту, радону, у вёсачцы Полымя, якая падзяліла лёс Хатыні, на рэках Бярэзіна і Дзіва, на азёрах Нарач і Доўтае, на Агінскім канале... Аўтар расказвае пра самыя ўнікальныя камень, дуб і школьны музей, пра месца падзення Брагінскага метэарыта, пра буйнейшую ў Еўропе калонію шэрых чапляў...

У кнізе пісьменнік закранае і пытанні экалогіі, падрабязна апісвае пра стан нашых лясоў, малых рэк, азёр, помнікаў прыроды.

Заглядваючы ў гістарычнае мінулае свайго краю, аўтар не можа абысці маўчаннем гераічную барацьбу нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Перажытае ім самім накладвае адбітак на тыя надзеі, што прайшлі перад вачамі самога пісьменніка, кранулі ягоную душу і сэрца.

●

"Ноччу выпаў сняжок. Прыкметна пабялелі і без таго белыя бярэзіны. Выразней сталі глядзецца камлі сосен. А чорная вольха так і крэсліць неба графікай галін.

Пасвятлелі ельнікі. На кожнай яліне вунь колькі снегу! Белы колер у спалучэнні з зялёным вельмі пасуе дрэвам. Дубровы таксама выглядаюць урачыста..."

Вось так прыгожа і ў той час проста, незагадкава пачынае пісьменнік свой расказ пра Белавежу, пушчанскі край. Больш чатыры стагоддзі таму сын палясоўшчыка Мікола Гусоўскі пісаў:

Музыка нашых лясоў
мілагучнасцю строгай
Вуху і сэрцу мілей
за літаўры і ліру...

"Яна, Белавежа, — піша аўтар, — у кожнага пакідае след, свой, адметны, непаўторны. Едуць сюды з усяго свету. А потым жывуць ёю доўга — ці не ўсё жыццё".

Пісьменнік, заглядваючы ў гісторыю Белавежскай пушчы, заўсёды падкрэсліваў, што яна была прыцягальнай і для высокіх чыноўнікаў, і для браканьераў. Так, апошні зубр, што жыў на волі, быў забіты браканьерам у 1919 годзе. Словам, знішчалі зуброў, іншых звяроў, хто хацеў і колькі хацеў.

Напрыклад, за два дні ў кастрычніку 1800 года цар Аляксандр II і яго світа забілі 28 зуброў, 23 вепры, 36 казуль і шмат іншых звяроў.

А царом Мікалаем II у час палявання з 18 па 30 жніўня 1900 года толькі адных зуброў было забіта 40.

●

Такім чынам, пушчанскі край шмат перажыў і пабачыў. Тут і побач у вёсках жыло многа цікавых людзей, жыццё і дзейнасць якіх былі звязаны з Белавежай. Так, адзін з іх — Мікалай Максімавіч Марчук, спецыяліст па вырабу чучал. Прафесія даволі рэдкая, якой ён аддаў ужо трыццаць пяць гадоў. Работы гэтага майстра можна сустрэць па ўсёй Беларусі. Яны нават экспанаваліся ў Маскве на ВДНГ.

Гэты майстар запомніўся як чалавек тонкага складу, чулай душы, бязмежна ўлюбёны ў родную прыроду. "Вучыцца ў прыроды — галоўнае для чалавека", — казаў Мікалай Максімавіч Марчук.

І гэта не проста словы, а ягоная перакананасць, праверaная самім жыццём, гадамі працы ў лесе.

"Лес мудрасць дае, — казаў ён. — У ім адчуваеш сябе найлепш. Там душою адпачываеш, хоць, бывае, і стомішся за дзень..."

Або варта прыпомніць яшчэ аднаго чалавека — Людмілу Яўгенаўну Дворак. Яна — батанік. Пра Белавежу можа расказваць бясконца. Героі яе расказаў — расліны. Яны, як і чалавек, жывуць, думаюць, радуюцца, крыўдуюць і г. д.

"Ой, даўняй любоўю люблю вясну!.. — хвалюючыся, апавядае Людміла Яўгенаўна. — Я заўсёды бягу ў пушчу па вясну, адшукаю кветкі, укленчу, але яны пазіраюць так даверліва, так падзіцячы, што рука не адважыцца сарваць. Наіўна? Толькі інакш не магу..."

●

Слухаючы маляўнічыя расказы Людмілы Яўгенаўны, пісьменніку так і хацелася сказаць ёй: "Вам бы вершы пісаць, Людміла Яўгенаўна!"

І не памыліўся ў сваім прадбачанні Яраслаў Пархута. Гартаючы падшыўку мясцовай раёнкі, ён натрапіў на знаёмае прозвішча. Гэтыя радкі былі падпісаны гэтым прозвішчам:

Праплывуць-
пралятуць гады
Пройдзе час, што мне
лёсам адпушчаны.
Адрадзіцца хацела б
тады
Хоць маленькай
часцінкаю пушчы.
Стаць хачу
векавою сасной,
Што прапахла
гаркавай жывіцай,
Ці звычайнай
лясной травой
На губах крутарогай
зубрыцы.

Пасля гэтых радкоў пісьменнік яшчэ раз пераканаўся: вось, яна, сапраўдная гаспадыня пушчанскага краю.

Вандраванні Яраслава Пархуты па родным краі, расказы яго пра самае-самае (самая высокая, самая нізкая, самая вялікая, самы стары і г. д.) захапляюць чытача перш за ўсё тым, што ўсе эсэ, навелы, лірычныя аповесці, словам, усё ўбачанае, перажытае і расказанае ў кнігах, — гэта праўда жыцця, нічога непрыдуманага і казачнага. Жыццё з усімі яго праявамі, колішнімі і цяперашнімі, чалавечымі лёсамі, паказаны глыбока і ўсебакова, дзе спалучаюцца трагічнае са смешным, боль з радасцю, трывога з захапленнем.

Пісьменнік часцей за ўсё застаецца, як кажуць, за кадрам, убаку, маўляў, глядзіце, слухайце, рабіце самі вывады. І, вядома, думайце! Таму што ў свеце ўсё ўзаемазвязана. Як правіла, адна бяда цягне за сабою другую, адно няшчасце кранае многіх.

●

Так было і 26 красавіка 1986 года. Была красавіцкая суботняя раніца. Іван Тарасавіч і Таццяна Пятроўна Ігнацэнкі, жыхары вёскі Спярыжжэ, што на беразе ракі Брагінка, чакалі прыезду сына (меліся саджаць бульбу). Сын працаваў у горадзе энергетыкаў — Прыпяці— пажарнікам (эсэ "Чужой бяды не бывае").

Якраз у тую ноч, як піша Яраслаў Пархута, на Чарнобыльскай АЭС здарыўся пажар.

"Першым на 70-мятровую вышыню са ствалом пажарнага рукава ўзняўся камандзір аддзялення Ігнаценка, яго падначаленыя і таварышы па службе... Іх было вельмі мала, і не было дарогі назад, не было іншага выйсця, як толькі перамагчы..."

Як кажа пісьменнік, яны зрабілі сваю работу. Іх замянілі іншыя.

"Ужо ў маскоўскай клініцы 28 красавіка Іван Тарасавіч спытае ў сына:

— Хіба нельга было пасцерагчыся?

— Нельга, тата, інакш не перамаглі б, — адказаў сын.

Ён, пажарнік, верыў, што перамог страшны пажар. Ён думаў не пра сябе, а пра справы таварышаў. Васіля Ігнаценкі не стала 13 мая. На Міцінскіх могілках Масквы Васілёва магіла — чацвёртая ў новым радзе.

Дарэчы, газета "Праўда" ад 9 чэрвеня 1986 года пісала: "Яны загінулі маладымі, але паспелі здзейсніць самае вялікае, што людзі могуць зрабіць для людзей, — абаранілі жыццё".

Менавіта цаною свайго жыцця абаранілі жыццё іншых. Яны былі першымі, што "згарэлі" ў агні радыяцыі.

●

"Я тады падумаў, — піша Яраслаў Пархута, — божухна, на якой танюсенькай нітачцы наша Зямля! Варта каму-небудзь зрабіць неабдуманы ці неасцярожны крок, нітачка тая перарвецца, і найпрыгажэйшая кланета Сусветуператворыцца ў мёртвую камлыгу. Гэта нават уявіць страшна!.."

А я дадаў бы: "Вельмі страшна". Для ўсяго жывога, і перш за ўсё для чалавека. Пасля той катастрофы мінула 16 гадоў. А людзі паміраюць і паміраюць. Не па старасці, а ад хвароб, якіх "падганяе" радыяцыя. Збаўленне ад гэтага — ніякага. Адны размовы і абяцанні. Ліквідатарам спярша давалі сякія-такія льготы, а потым іх амаль забралі. Жывіце, маўляў, як хочаце. І дажываюць, і паміраюць.

Многія перасяленцы, паспытаўшы перасяленцкага хлеба, вяртаюцца на ранейшыя месцы. Нідзе няма лепш як дома. Свае тут людзі, свае могілкі з пахаванымі родзічамі. Свая зямля і лес, хоць кажуць, што заражоныя. Але сваё.

У многіх месцах, якія забруджаны, жывуць людзі. Самыя высокія чыноўнікі рашылі (маўляў, ім зверху відней) адмяніць усякія льготы насельніцтву, выдаўшы наконт гэтага сваю пастанову. Першай ахвярай у гэтым спісе стаў г. п. Антопаль Драгічынскага раёна. У тым жа раёне яшчэ не адзін дзесятак сельскіх населеных пунктаў таксама забруджаны радыяцыяй. Лёс іх таксама вырашаецца, і, думаецца, не ў лепшы бок. І тымі, хто далёка жыве ад гэтай радыяцыі, ад гэтай нябачнай смерці.

●

Мая радзіма — горад Нароўля Гомельскай вобласці. Многа людзей з'ехала з райцэнтра і раёна ў пошуках чыстай зоны. Частка маіх землякоў жыве на Брэстчыне. Частка прыжылася, частка вярнулася дамоў. Але многа забітых вокнаў і ў райцэнтры, і ў вёсках, што засталіся, не былі "пахаваны". Тут, у забруджанай зоне, жывуць людзі, "дзейнічаюць" калгасы. Хоць і нямнога прадукцыі (збожжа, малако, мяса), але прадаюць дзяржаве. Такім чынам, ужо 16 гадоў радыяцыя ўжо ў прадуктах раслінаводства і жывёлагадоўлі разносіцца па ўсёй Беларусі, і ўсё насельніцтва краіны атрымлівае тыя смяротныя радыяцыйныя часцінкі.

Святаслаў КАЖАДУБ.

г. Івацэвічы.

(Працяг будзе).



Яраслаў Пархута дома, у час адпачынку.



Вёсачка Полымя, якую напаткаў лёс Хатыні.

ЯК ВУЧАЦЦА Ў ПОЛЬСКІХ ШКОЛАХ?

Сусветна вядомая арганізацыя Еўрапейскі Форум і Адукацыйны Цэнтр (Фундацыя) імя Сцяпана Баторыя, што знаходзіцца ў Варшаве, ужо на працягу двух гадоў штыра запрашае з розных куткоў нашай рэспублікі лепшых педагогаў у творчую камандзіроўку па абмену вопытам. Запрашэнне ажыццяўляецца на аснове конкурснага адбору — па выніках анкетавання. Беларускія спецыялісты сістэмы адукацыі маюць магчымасць наведаць замежныя школы, ліцэі, дзіцячыя садкі, пазашкольныя установы і грамадскія аб'яднанні. У маі і чэрвені гэтага года тры групы нашых настаўнікаў пабывалі ў польскіх адукацыйных установах, як вясковых , так і гарадскіх.



Дырэктар СШ №1 г. Бярозы Мікалай Васільевіч Жуковіч.



Настаўнік і вучні польскага ліцэя "Сплот" ў г. Новы Сонч разам складаюць расклад заняткаў на год.

Нашаму земляку — Мікалаю Васільевічу Жуковічу, дырэктару СШ №1 г. Бярозы, лаўрэату абласнога конкурсу "Настаўнік года — 92", аўтару шматлікіх артыкулаў па методыцы выкладання беларускай мовы і літаратуры ў школе — пашчасціла таксама цэлы майскі тыдзень паўдзельнічаць у замежным семінары па тэме "Пазашкольная адукацыя ў Польшчы" і наведаць славутыя мясціны гэтай краіны.

— У чым адрозненне сучаснай польскай сістэмы адукацыі ад беларускай?

— Сапраўды, хоць беларуская і польская сістэмы школьнай адукацыі практычна аднachасова пачалі рэфармаванне, але адрозненні назіраюцца значныя, асабліва ў ступенях навучання, у ацэнцы дзейнасці вучня і ў змесце і структуры вывучаемых дысцыплін. У польскай школе чатыры ступені навучання: пачатковая школа — гэта вучні нулявога — трэццяга класаў, так званую "падставовую" (сярэднюю) ступень складаюць школьнікі чацвёртага — шостага класаў. Пасля здачы камбінаванага дзяржаўнага экзамена шасцікласнік пераходзіць вучыцца ў гімназію (вучні сёмага — дзевятага класаў). І апошняй, чацвёртай, ступенню сістэмы з'яўляецца ліцэй (дзесяты — дванаццаты класы), дзе ідзе мэтанакіраваная падрыхтоўка лепшых школьнікаў да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы як сваёй краіны, так і ў замежныя. Асобных польскія вучні абмяжоўваюцца толькі гімназічнай адукацыяй, а далей ідзе прафесійная падрыхтоўка ці сама праца.

Адпаведна вышэй названым ступеням адукацыі функцыянуюць і асобныя будынкі, асабліва ў гарадах: "падставовыя" школы, гімназія, ліцэй.

У школьнікаў нулявога — трэццяга класаў адсутнічаюць адзнакі, яны носяць апісальны характар: "S" — супер!, "А" — вельмі добра, "В" — добра, "С" — можна лепш, "D" — дрэнна. Працу падлеткаў 4 —6 класаў гімназій, ліцэяў педагогі ацэньваюць шасцібальнай шкалой.

Польскія вучні, як і нашы, вывучаюць матэматыку, інфарматыку, гісторыю, родную і замежную мовы, але асобныя прадметы вывучаюцца інтэгравана. Напрыклад, аб'яднана польская мова і літаратура. У курс мастацтва ўваходзяць рысаванне, музыка, рытміка. У такой дысцыпліны, як "прырода", ёсць рэгіянальны напрамак вывучэння, так званыя сцяжынкі — экалагічная, краязнаўчая, здаровы лад жыцця і іншыя.

— Якім чынам у польскіх школах назначаюць дырэктара?

— Мне як кіраўніку навучальнай установы цікава было пачуць, што дырэктарам польскай школы можа стаць толькі той педагог, які пройдзе конкурсны адбор. Кантракт заключаецца з ім толькі на пяць гадоў. Кадравым забеспячэннем навучальнай установы займаецца толькі дырэктар, а не кіраўніцтва раённым ці гарадскім аддзелам адукацыі. У час франтальнай праверкі школы ўпраўленне аддзела адукацыі правярае дзейнасць і наведвае ўрокі толькі дырэктара, настаўнікі пад такую праверку не падпадаюць.

— Якія прыярытэты польскай сістэмы адукацыі?

— На маю думку, галоўнай перавагай з'яўляецца тое, што ў школе практычна ў кожным класе па дзве гадзіны ў тыдзень выкладаецца такая дысцыпліна, як рэлігія. І вядзе заняткі з дзецьмі сам ксендз (пробашч). Зразумела, што ўжо толькі наяўнасць гэтага прадмета вырашае многія маральныя праблемы ў грамадстве: "не забі", "не ўкрадзь" і г. д. На жаль, у Беларусі з-за прычыны шматлікай наяўнасці рэлігійных канфесій, асабліва на Брэстчыне і Гродзеншчыне, такую дысцыпліну Міністэрства адукацыі ўвесці ў школы проста не будзе мець права.

Другім прыярытэтам польскай сістэмы, на маю думку, з'яўляецца наяўнасць пакуль невялікай сеткі недзяржаўных школ, якія функцыянуюць за кошт грамадскіх аб'яднанняў, бацькоўскай платы і дзяржаўных датацый. У такой ўстанове па-сапраўднаму ажыццяўляюцца асобасна-арыентаваны і дыферэнцыраваны падыходы да асобы падлетка.

Яшчэ адным прыярытэтам польскай школы можна лічыць шматлікую наяўнасць вучэбных праграм і падручнікаў па адным у школьнаму прадмету практычна ў кожным класе. Тут настаўнік мае шырокае права выбару. Дарэчы, у нас зараз толькі беларускі настаўнік роднай літаратуры мае для выбару дзве праграммы і два камплекты падручнікаў, складзеных і напісаных калектывамі Нацыянальнага інстытута адукацыі і кафедрай беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Яшчэ адной перавагай польскіх навучальных устаноў з'яўляецца дастатковая наяўнасць камп'ютэраў, аўдые- і відэаўстановак, капіравальнай тэхнікі. Без гэтага зараз нельга абысціся ў сучаснай рэфармуемай школе.

Спадабаліся мне і польскія рэгіянальныя прадметы, "сцяжыны". Цікава было назіраць за працай дзяцей, калі адзін мінікалектыў на ўроку рабіў фотагазету пра мясцовыя помнікі дойлідства, другі — маляваў нацыянальнае мужчынскае і жаночае адзенне XIX стагоддзя, трэці калектыў школьнікаў рыхтаваў паведамленне пра побыт свайго жыхара-земляка, выкарыстоўваючы ў час дэманстрацыі ўсім прысутным прылады даўніны, узятыя са свайго школьнага этнаграфічнага кутка. Нацыянальная самабытнасць, выхаванне ў школьнікаў павагі і цікавасці да гістарычнай і культурнай спадчыны свайго народа — гэта, лічу, яшчэ адзін прыярытэт навучальных устаноў Польшчы.

— Што Вас найбольш уразіла ў польскіх школах?

— Калі браць пад увагу чыста чалавечыя ўражанні, то гэта прысутнасць у навучальных установах ксяндза, апранутага ў чорнае адзенне. (Не ўдалося, на жаль, пабыць на яго ўроку).

Як спецыяліст беларускай філалогіі, я быў прыемна ўражаны інтэграваным курсам польскай мовы, методыкай яго выкладання. Нават прывёз дадому некаторыя падручнікі і праграмы, каб расказаць і паказаць сваім настаўнікам, пераняць такі-сякі вопыт.

Быў здзіўлены, што польскі настаўнік вымушаны плаціць уласныя фінансавыя сродкі за курсы павышэння кваліфікацыі.

Размаўляў
Мікалай СІНКЕВІЧ.
г. Бяроза.

"Жена в роддоме, а я задумался..."

Жертв аварии нет, материальный урон — приличный





Александр ГОРБАЧ.

Весьма необычное зрелище открылось прохожим 2 июля на перекрёстке улиц Ленина и Клютко в г. Ивацевичи.

Водитель "Ауди-100" поздно среагировал на запрещающий сигнал светофора, создалась аварийная ситуация, в ходе которой, кроме "сотки", сильно пострадала "Газель" — она перевернулась.

Жертв нет. Водитель "Ауди - 100" (машина, кстати, на гродненских номерах) взял ответственность за случившееся на себя.

Александр ГОРБАЧ.
г. Ивацевичи.

"Ивацевичдрев" пока аутсайдер

Закончился первый круг чемпионата области по футболу в восточной и западной зонах. Осталось провести несколько матчей. Вот как выглядит турнирная таблица.

ЗАПАДНАЯ ЗОНА

Команды	И	В	Н	П	О
1. Водоканал (Брест)	8	6	1	1	19
2. Пружаны	**8**	**5**	**1**	**2**	**16**
3. Динамо-1 (Брест)	7	5	1	1	16
4. Надежда (Кобрин)	7	5	1	1	16
5. Орион (Жабинка)	8	4	2	2	14
6. Белоозёрск	**7**	**3**	**0**	**4**	**9**
7. Тевли (Кобринский район)	8	2	1	6	7
8. Динамо-2 (Брест)	5	2	0	3	6
9. Каменец	8	1	1	6	4
10. Беларусь (Кобринский район)	6	1	0	5	3

ВОСТОЧНАЯ ЗОНА

Команды	И	В	Н	П	О
1. Пищевик (Ганцевичи)	8	7	1	0	22
2. Коммунальник (Столин)	8	5	1	2	16
3. Полесье — 2000 (Пинск)	8	4	2	2	14
4. ЗКИ (Молодковичи)	8	4	1	3	13
5. КУПП (Маньковичи)	8	3	2	3	11
6. Россия — РАПТ (Лунинец)	8	3	0	5	9
7. Атлант (Барановичи)	7	3	0	4	9
8. Белсолод (Иваново)	8	1	1	6	4
9. Ивацевичдрев	**7**	**1**	**0**	**6**	**3**


Рэклама, віншаванні

Сердечно поздравляем!

От всей души поздравляем дорогую и любимую мамочку, тещу и бабушку Евгению Игнатьевну ЕФИМИК из д. Мироним Ивацевичского р-на с днем рождения. Прими от нас, родная, пожелания здоровья и добра, света и тепла, уюта и покоя.

В предании старом говорится:
Когда родится человек,
Звезда на небе загорится,
Чтобы светить ему навек.
Так пусть звезда тебе сияет
По крайней мере лет до ста,
Пусть счастье дом твой окружает,
Пусть радость будет в нем всегда.

С уважением и любовью — дочери Валя и Мария, зять Леонид, внуки Ирина, Андрей, Ваня и Саша.



Поздравляем с 18-летием Ольгу НАХВАТ из г. Ивацевичи. Желаем крепкого здоровья, удачи, исполнения желаний, душевного богатства, любви.

С днем рождения тебя поздравляем.
Ты смотри, в этот день не грусти.
Только счастья тебе мы желаем,
Ну, а счастье твое — впереди.

С любовью — бабушка, крестная, тетя Женя и их семьи.



Сердечно поздравляем с 40-летием Галину Васильевну КЛЮТКО из д. Ходаки Ивацевичского р-на. От всей души желаем крепкого здоровья, удачи во всем, добра и счастья, всегда прекрасного настроения и всего самого наилучшего в жизни. Пусть эта замечательная дата в душе твоей оставит след. Желаем всего, чем жизнь богата — здоровья, счастья, мира, долгих лет.

С уважением — семья Савчуков.



От всей души поздравляем с днем рождения бабушку Галину Ивановну МИХНИКЕВИЧ из д. Воля Ивацевичского р-на. Желаем крепкого здоровья, успехов в работе и долгих лет жизни.

Внучки Светлана и Наташа.



Дорогого и любимого сыночка, братика и племянника Николая СЕМЕНЦА из д. Могилицы Ивацевичского р-на поздравляем с прекрасной датой — 18-летием со дня рождения. Желаем крепкого здоровья, голубого неба, семейного благополучия, взаимопонимания в семье и в кругу друзей.

Пусть этот день, такой чудесный,
Подарит счастье, светлое, как снег.
Пусть твоя жизнь проходит интересно,
И ждут всегда удача и успех.

С любовью — мама, папа, брат Саша, остальные родственники.



От всего сердца поздравляем с днем рождения Ольгу Анатольевну МАКАРЕВИЧ из г. Ивацевичи. Желаем любви, здоровья счастья, успехов везде и во всем.

С уважением — мама, папа, Света и Наташа.



ПРОДАЮТСЯ

РАЗНОЕ

☞ Черепица "Забудова". Цвет черный, 150 м². Тел (8-245) 2-50-31.

☞ Новые ульи (дадан). Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-37-10.

☞ Газовая плита настольная, двухкамфорная, балон газовый, новый. Тел. в Ивацевичском р-не (8-245) 33-9-83.

☞ Пчелы с ульями. Тел в г. Ивацевичи (8-245) 2-37-10.

☞ Кухня, стенка, спальня, прихожая. Тел. в Ивацевичском р-не (8-245) 32-1-96.

☞ Средство защиты от жука "Каратэ" и "Фостак". Тел. в г. Береза (8-243) 27-6-45 (в любое время).

☞ Холодильник-морозильник "Siemens", б/у. Тел. в г. Белоозерск (8-243) 26-4-52.

☞ Кухня, стенка, спальня, прихожая. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-42-94.

☞ Емкость 5 т., дюраль. Тел. в г. Пружаны (8-232) 7-24-38.

☞ Корова. Тел. в Ивацевичском р-не (8-245) 68-2-87.

☞ Торговая палатка, 2х3 метра. Тел. в г. Береза (8-243) 26-4-52.

☞ Новый мягкий уголок, обтяжка — гобелен, недорого. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-67-93.

☞ СВЧ-печь, ЦТ, все б/у. Тел. в г. Береза (8-243) 4-14-73.

☞ Палатка торговая, 2х2,5 м, б/у 1 месяц, цена 55 у. е. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-42-16.

☞ Щенки ротвейлера с родословной. Тел. в г. Береза (8-243) 2-10-02.

☞ Щенки американского бульдога, клейменные, с родословной, для обеспеченных семей. Тел. в г. Пружаны (8-232) 7-10-04.

☞ Картофелекопалка конная 1-рядная, РП, можно цеплять и за трактор. Тел. в Дрогичинском р-не (8-244) 7-46-28.

☞ Балон для сжиженного газа с ящиком, плита газовая, б/у, недорого. Обращаться: Ивацевичский р-н, г. Коссово, ул. Советская, 19.

☞ Сигнализация автономная для квартир, магазинов. Тел. в г. Береза (8-243) 2-88-23.

☞ Стиральная машина, СВЧ печь, пылесос, ЦТ, морозильник, всё б/у из Германии. Тел. в г. Береза (8-243) 4-92-28.

☞ Картофель кормовой. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-10-36.

☞ Холодильник-морозильник "Стинол", цветной, новый, гарантия 3 года. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-12-68 (после 18.00).

☞ ТВ "Горизонт-670", 54 см по диагонали, кинескоп "TOMSON", новый, гарантия 2 года. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-12-68 (после 18.00).

☞ Коляска детская, закрытая, импортная, б/у. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-83-22 (вечером).

☞ Пылесос "SAMSUNG", телевизор "PANASONIC", всё новое, гарантия. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-81-23.

☞ Музыкальный центр "PANASONIC", видеомагнитофон "PANASONIC", всё новое, гарантия. Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-81-23.

☞ Цветок манстера, высота 1,5 м. Тел. в г. Береза (8-243) 4-21-52.

☞ Антикварнатый видеомагнитофон "Norgmenge", цена — 30 у. е. Тел. в г. Береза (8-243) 4-25-68 (после 17.00).

☞ Ручной вязальный аппарат двухизнаночного переплетения, однокоретoчный "Меда". Тел. в г. Ивацевичи (8-245) 2-25-88 (в любое время).

☞ Стиральная машина "Вясёлка СМ-1,5", с подставкой на ванную — 40 т. руб., ЦТ "HORIZONT" 42 CTV 510 E-I — 130 т. руб., всё б/у. Тел. в г. Береза (8-243) 4-16-61.

☞ Холодильник "Минск-15", 2-камерный, б/у, цена 255 тыс. руб. Тел. в г. Береза (8-245) 4-76-95.

☞ Фотоаппарат "ФЭД-5С" со всеми фотопринадлежностями. Тел. в г. Береза (8-243) 4-76-95.

☞ Кинескоп "61ЛК3Ц". Тел. в г. Береза (8-243) 4-76-95.

☞ Новая стирально-сушильная машина "Везелица". Тел. в г. Береза (8-243) 4-76-95.

☞ Диван-кровать, односпальный, с тумбой для белья, с полками для книг. Тел. в г. Береза (8-243) 4-76-95.

☞ Коляска, б/у, комбинированная, тройка, синяя, ручка перекидная, сост. хор., 60 у. е. Тел. в Ивацевичском р-не (8-245) 45-3-09.

